# Аб рабоце, якая праводзіцца па пытанні адмены роўмінгу на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы

З 2017 года Рэспубліка Беларусь і Расійская Федэрацыя праводзяць работу па пытанні адмены роўмінгу на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы.

Вынікам работы стала «Дарожная карта па рэалізацыі рэзалюцыі Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы ад 30.06.2017г. па пытанні аб адмене роўмінгу на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы» (далей - Дарожная карта), якая зацверджана 20 снежня 2019 гады кіраўнікамі галіновых міністэрстваў - Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам лічбавага развіцця, сувязі і масавых камунікацый Расійскай Федэрацыі.

Дарожная карта прадугледжвае аднамомантавае (верасень 2020 года) уступленне ў сілу дамоўленасцей, дасягнутых па выніках рэалізацыі наступных трох этапаў:

1) устанаўленне адзінай стаўкі міжнароднага інтэрканэкту для роўмінгавых званкоў ва ўзаемаразліках аператараў сувязі Рэспублікі Беларусь і Расійскай федэрацыі;

2) зніжэнне аператарамі сотавай рухомай электрасувязі Беларусі і Расіі міжаператарскіх аптовых тарыфаў на паслугі міжнароднага роўмінгу (голас, смс, перадача даных);

3) фарміраванне аператарамі сотавай рухомай электрасувязі Беларусі і Расіі абаненцкіх рознічных тарыфаў на паслугі міжнароднага роўмінгу.

Па выніках выканання 1 і 2 этапаў чакаецца падпісанне 22 пагадненняў паміж аператарамі сувязі дзвюх дзяржаў.

У цяперашні час рэалізацыя 1 і 2 этапаў Дарожнай карты працягваецца, адзначаецца адставанне ад вызначанага графіка.

Прычынамі адставання з'яўляецца склаўшаяся эпідэміялагічная сітуацыя, перавод кампаній на аддаленую працу, уведзены карантын на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі, што запавольвае дакументальнае афармленне пагадненняў.

Пры гэтым, адзначаем, што шэраг пагадненняў першага этапу падпісаны, большасць пагадненняў другога этапу ў статусе высокай ступені ўзгаднення, аператары электрасувязі дзвюх краін знаходзяцца ў пастаянным дыстанцыйным кантакце для пошуку рашэнняў іх падпісання.

Узровень абаненцкіх тарыфаў на роўмінг будзе вызначаны аператарамі па выніках рэалізацыі трэцяга этапу Дарожнай карты, які павінен завяршыцца у жніўні 2020 года.

Змяненне тэрмінаў, устаноўленых Дарожнай картай у цяперашні час не плануецца.

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/27-05-2020-6444*